ТОЙ
318746

# Беларуская мова

8 клас

## Дыктанты, пераказы, пераклады



Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў

*Пад рэдакцыяй П.А. Міхайлава*

Рэкамендавана ўстановай «Навукова-метадычны цэнтр вучэбнай кнігі і сродкаў навучання» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*2-е выданне*

Мінск
«Аверсэв»
2003

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 808.26(075.3)
ББК 81.2Беи-922
Б43

***Аўтары:***

І. Л. Бурак, П. А. Міхайлаў, Т. А. Мытнік, Н. У. Чайка

Рэцэнзенты:

канд. філал. навук, дац. каф. рыторыкі і методыкі выкладання моў і літаратур Бел. дзярж. ун-та ***І. М. Саматыя***; настаўнік бел. мовы і літ-ры СШ № 2 г. Маладзечна ***Г. Ф. Гусева***

**Беларуская мова: Дыктанты, пераказы, пераклады:**
Б43 8 клас: Дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. шк., гімназій, ліцэяў/І. Л. Бурак, П. А. Міхайлаў, Т. А. Мытнік, Н. У. Чайка; Пад рэд. П. А. Міхайлава. — 2-е выд. — Мн.: «Аверсэв», 2003. — 224 с.
ISBN 985-478-208-5.

Дапаможнік прызначаны настаўнікам і навучэнцам школ, гімназій і ліцэяў для замацавання і ўдасканальвання сваіх ведаў па беларускай мове.

Раздзелы дапаможніка адпавядаюць асноўным навучальным тэмам праграмы агульнаадукацыйнай школы і падручнікаў для навучэнцаў 8 класа.

**УДК 808.26(075.3)**
**ББК 81.2Беи-922**

*Вучэбнае выданне*

**Бурак** Ірына Леанідаўна
**Міхайлаў** Павел Аляксандравіч
**Мытнік** Таццяна Аляксандраўна
**Чайка** Наталля Уладзіміраўна

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

**Дыктанты, пераказы, пераклады**

**8 клас**

Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў

*2-е выданне*

Адказны за выпуск *Дз. Л. Дзямбоўскі*

Падпісана ў друк з гатовых дыяпазітываў 24.07.2003. Фармат 84×108 $^1/_{32}$.
Папера друкарская № 2. Гарнітура «Школьная». Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 11,76. Ул.-выд. арк. 7,54. Тыраж 5100 экз. Зак. 166.
Пасведчанне № 08-33-0.156048
аб дзяржаўнай гігіенічнай рэгістрацыі прадукту ад 13.12.200.
Таварыства з дадатковай адказнасцю «Аверсэв».
Ліцэнзія ЛВ № 106 ад 25.07.2002. Кантактны тэлефон (017) 210-18-.8.
E-mail: info@aversev.com; www.aversev.com
Рэспубліка Беларусь, 220123, Мінск, М. Багдановіча, 129а.
Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
220013, Мінск, праспект Ф. Скарыны, 79.

ISBN 985-478-208-5

© Калектыў аўтараў, 2002
© Афармленне. ТДА «Аверсэв», 2002

## ПРАДМОВА

*Гэты дапаможнік прызначаны настаўнікам і навучэнцам школ, гімназій і ліцэяў для замацавання і ўдасканальвання сваіх ведаў па беларускай мове. Ён складзены ў поўнай адпаведнасці з дзеючай вучэбнай праграмай і падручнікамі па беларускай мове для 8 класа школ з рускай і беларускай мовамі навучання, а таксама з улікам «Адзінага моўнага і арфаграфічнага рэжыму школы»*.*

*Кніга складаецца з дзевяці самастойных раздзелаў: «Словазлучэнне», «Сказ», «Просты сказ: двухсастаўныя сказы», «Просты сказ: аднасастаўныя сказы», «Просты сказ: няпоўныя сказы», «Просты сказ: сказы з аднароднымі членамі», «Просты сказ: сказы са зваротkамі, пабочнымі словамі і выклічнікамі», «Просты сказ: сказы з адасобленымі членамі», «Спосабы перадачы чужой мовы». Гэтыя раздзелы адпавядаюць асобным навучальным тэмам і размяшчаюцца строга ў паслядоўнасці, вызначанай вучэбнай праграмай і падручнікамі для навучэнцаў 8 класа.*

*Кожны асобны раздзел змяшчае тры віды пісьмовых прац — дыктанты, пераказы і пераклады, мэтанакіравана*

---

* Праграмы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы з беларускай мовай навучання: Беларуская мова. V—XI класы. — Мн., 2000.

Праграмы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы з рускай мовай навучання: Беларуская мова. V—XI класы. — Мн., 2000.

Антанюк Л. А., Бадзевіч З. І., Кныш М. К., Саматыя І. М. Беларуская мова: Сінтаксіс і пунктуацыя: Падручнік для 8 класа школ з беларускай мовай навучання. Выданне другое. — Мн., 2001.

Тамашэвіч Т. І. Беларуская мова: Падручнік для 8 класа школ з рускай мовай навучання. — Мн., 1999.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Падкрэсліць па тры словазлучэнні, словы ў якіх аб'яднаны спосабам дапасавання, спосабам кіравання і спосабам прымыкання.

**ПРЫКЛАДНЫ ПЛАН**

1. Просьба Фаэтона.
2. Паездка па небе.
3. Гібель Фаэтона.

**АПОРНЫЯ СЛОВАЗЛУЧЭННІ**

Прыйсці ў палац, паехаць па небе на залатой калясніцы, сустрэць шмат прыгожага, запрэгчы крылатых коней, не ў сілах кіраваць коньмі, пабялець ад страху, полымя ахоплівае зямлю, зіхатлівай маланкай разбіць калясніцу.

# СКАЗ

## ДЫКТАНТЫ

### ПАПЕРАДЖАЛЬНЫЯ ДЫКТАНТЫ

#### Летняя ноч

Люблю я ціхія халаднаватыя ночы, што бываюць у канцы лета і на пачатку восені. Гэта ночы, якімі гэтыя дзве пары года як бы адмяжоўваюцца адна ад аднае. Такія ночы бываюць у другой палове або ў самым канцы жніўня месяца.

Выходзіш на двор. Неба чыстае, толькі па краях смутна чарнеюць палоскі хмарак. У адным месцы неба чырвонае, і чуць-чуць трапечуцца бляскі агню і асвячаюць кусочак неба пры самай зямлі, пакрыты тонкім слоем далёкіх хмар. У другім баку блішчыць зарніца. Бляск не перастае ні на адну хвіліну. То там, то сям вырываюцца яркія палоскі святла.. Зарніцы запальваюцца і прападаюць.

Дарма вуха прыслухоўваецца да грому: усё ціха! Што гэта? Далёка-далёка бушуе недзе навальніца, і толькі водбліскі маланкі ловіць вока на краі чорнага неба. Божа! Які дзіўны абраз — адно толькі адбіцце твайго гневу!

А ноч! Што за ноч! Якая цішыня, якая цішыня! І многа кажа для сэрца і розуму чалавека гэты спакой, гэты дзіўны вобраз ночы! (153 словы)

*Паводле Якуба Коласа*

**ЗАДАННІ**

1. Назавіце, якія сказы па мэце выказвання сустракаюцца ў тэксце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаных сказах.
3. Падбярыце сінонімы да слоў **бляск, святло**. Вызначце марфемы ў гэтых словах.

### Невядомы востраў

Прачнуўся я позна. Надвор'е было яснае, вецер суцішыўся, мора больш не шалела.

Я зірнуў на пакінуты намі карабель і са здзіўленнем убачыў, што на ранейшым месцы яго ўжо няма. Цяпер яго прыбіла бліжэй да берага. Ён апынуўся **непадалёку** ад той самай скалы, аб якую мяне ледзь не разбіла хваляй. Напэўна, **уначы** яго ўзняў прыліў, зрушыў з мелі і прыгнаў сюды. Цяпер ён стаяў не далей мілі ад таго месца, дзе я начаваў. Хвалі, відаць, не разбілі яго: ён добра трымаўся на вадзе.

Я вырашыў зараз жа прабрацца на карабель, каб зрабіць запас правізіі і розных рэчаў.

Злезшы з дрэва, я яшчэ раз агледзеўся **наўкола**. Першае, што я ўбачыў, гэта была наша шлюпка, якая ляжала **праваруч** на беразе, мілі за дзве адсюль — там, куды яе шпурнуў ураган. (126 слоў)

*Паводле Д. Дэфо*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці ў тэксце і выдзеліць сказы з прамым парадкам слоў.
2. Вызначыць, на які член сказа прыпадае лагічны націск пры прамым парадку слоў.
3. Растлумачыць правапіс выдзеленых слоў. Якімі часцінамі мовы з'яўляюцца гэтыя словы? Якую сінтаксічную ролю яны выконваюць у сказах?

## КАМЕНЦІРАВАНЫЯ ДЫКТАНТЫ

### Вясна ў горадзе

Майскае сонца высока стаяла ў ясным небе, кідала на зямлю снапы гарачых праменняў і залівала асляпляльным бляскам увесь свет. Над галавою сівеў кавалачак неба, каменныя сцены высокіх гарадскіх дамоў закрывалі ад вачэй усю шыр і глыб белага свету. Светлая хмарка, як ціхая думка шчасця, ціха і спакойна плыла ў небе і зараз жа хавалася ад людзей за высокімі каменнымі дамамі.

Людзі, чужыя адзін аднаму, прагныя да ўсяго пустога і непатрэбнага, ішлі ды ішлі, як хвалі рачныя, абганялі адзін другога, кудысьці спяшаліся.

Горад шумеў як дзень, так ноч тысячамі галасоў. Ляскаталі лёгкія каляскі, грукалі другія, цяжкія, наваленыя паклажай вазы. Тут жа часамі нясмела пастукваў мужыцкі воз, мізэрны конік дробна перабіраў нагамі па цвёрдым бруку. Усё гэта збівалася ў нешта адно цэлае, і ўся гэтая стракатасць грамады біла ў вочы. (128 слоў)

*Паводле Якуба Коласа*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці і падкрэсліць сказы з адваротным парадкам слоў.
2. Вызначыць, на якія члены сказа прыпадае лагічны націск пры адваротным парадку слоў.
3. Падкрэсліць у сказе дзейнікі і выказнікі. Вызначыць, якімі часцінамі мовы яны выражаны.

### Пераможаны дуб

Далібор злез з каня, пагладзіў рукою дубовую кару. Упершыню ў сваім жыцці бачыў ён пераможаны дуб. Часта сустракаліся яму разбітыя дрэвы, абсмаленыя маланкай, з разарванай карой, з чорнымі ямінамі дуплаў. Нямоцна стаялі яны. Але стаялі! Гэты ж дуб ляжаў, як мёртвы чалавек. Страшна было бачыць ягонае бяссілле. «Слабая тут зямля, не ўтрымала цябе», — успомніліся княжычу словы халопа. Значыць, на моцнай зямлі трэба сяліцца. Толькі дзе моцная зямля? Зноў прыгадаўся Далібору начны навальнічны двор дзядзінца, бацька, што, хаваючыся ад усіх, сустракаў незнаёмца. Ці на моцнай зямлі жывеш, бацька?

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Нарэшце дабраліся да Цёмнай гары. На лясным лужку кінулі коней, спутаўшы іх, а самі па вузкай сцежцы пайшлі на сіні слуп дыму, які нерухома стаяў над шчэццю дрэў. Адразу прыкмеціў Далібор: тут было многа яшчарак. Яны няспынна мільгалі ў траве, грэліся на камянях і каменьчыках. Іхнія маленькія бліскучыя вочкі-кропелькі як бы танцавалі нейкі танец. (141 слова)

*Паводле Л. Дайнекі*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці ў тэксце сказы з адваротным парадкам слоў. Падкрэсліць граматычныя асновы ў гэтых сказах.
2. Вызначыць, на якія члены сказа прыпадае лагічны націск у сказах з адваротным парадкам слоў.
3. Зрабіць марфемны разбор дзеепрыметнікаў, што сустрэліся ў тэксце. Ад якіх форм дзеяслова яны ўтвораны?

## ТЛУМАЧАЛЬНЫ ДЫКТАНТ

### Надыход восені

Поле ўжо апусцела. Кончана работа сярпа, пачынаюць капаць бульбу. **Далёка дзесьці ў небе плаўна нясецца крык жураўлёў.** Прыслухоўваешся, падымаеш вочы ўгору, шукаеш чародку жураўлёў. Вось мільганула ў небе чорная палоска. Высока-высока ляцяць жураўлі, пастроіўшыся вуглом у два няроўныя радочкі, і кідаюць на зямлю свой звонкі, працяжны і нудны крык. Глядзіш на жураўліны ключ, які плыве далёка ў небе, пакуль ён не схаваецца з вачэй. І нейкі жаль агортвае душу, усё роўна як праводзіш у далёкую старану дарагога чалавека. З якой радасцю сустракаеш птушак вясною, з такім жалем праважаеш іх увосень, як ляцяць яны ў вырай. І памалу ўсе птушкі, каторыя прыляцелі к нам вясною, зноў пакінулі нас на ўсю зіму. (111 слоў)

*Паводле Якуба Коласа*



**ЗАДАННІ**

1. Знайсці сказы з прамым парадкам слоў.
2. Падкрэсліць словы, на якія прыпадае лагічны націск у сказах з прамым парадкам слоў.
3. Зрабіць сінтаксічны разбор выдзеленага сказа.

## ВОЛЬНЫ ДЫКТАНТ

### Стары лес

Лес шумеў неяк вельмі нудна. Лес рэдка калі маўчыць. Прывычнае вуха лавіла ў ім галасы, але ніхто яшчэ не ўнікнуў у тайну яго мовы; толькі сэрца смутна адгадвае ў ім нуду і трывогу.

Касматыя яловыя вяршыні трасліся, як у шалёным танцы. Лапы то падымаліся, то апускаліся, як бы лавілі нявіднага ворага, які не даваў спакою і прымушаў трасціся лес. Старыя елкі глядзеліся ў неба і думалі нейкую думу.

Лес шумеў. Смутна шумеў стары лес.

З краю лесу стаяла хатка лесніка Васіля Чурылы. Маленькае акенца хаткі смутным значком пазірала ў поле. Здалек яно здавалася воўчым вокам. Над самым акенцам звісла голая вярбіна і глуха шумела, усё роўна як стагнала. (108 слоў)

*Паводле Якуба Коласа*

**ЗАДАННЕ**

Запісаць тэкст у вольнай форме, выкарыстоўваючы сказы з прамым і адваротным парадкам слоў для выдзялення актуальнай часткі паведамлення.

## ДЫКТАНТЫ «ПІСЬМО ПА ПАМЯЦІ»

### Вясновая ноч

Веснавая цёплая ноч толькі што апранула зямлю і раскідала свае таемныя чары, поўныя крыху смутнага характва. Першыя зоры ўжо замігацелі то



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

там, то сям у бяздонным небе, а з-за лесу залатым пажарам узнімаўся кругам бліщчасты месяц. Дробныя белыя хмаркі высцілалі яму дарожку сваімі лёгкімі празрыстымі тканінамі і расступаліся перад ім, скупануўшы ў яго бляску свае танкарунныя кудры. Пахла зямля, багата акропленая расою.

У сяле чулася гаворка і песні. У лагчыне над Нёманам дружна і заложна краткалі жабы. Было нешта смутнае і жалобнае ў гэтай простай і аднатоннай іх песні, што чапала душу ціхім смуткам і так сугалосна злівалася з маладою задумаю веснавой ночы. Сяло заціхала. Зрэдку па вуліцы брыла адзінокая постаць селяніна, што дзесь запазніўся. Толькі дзяўчаты яшчэ не спалі і спявалі на прызбах песні. (125 слоў)

*Паводле Якуба Коласа*

**ЗАДАННІ**

1. Выдзеліць у тэксце апорныя словазлучэнні. Запісаць яго па апорных словазлучэннях.
2. Знайсці ў тэксце і падкрэсліць сказы з адваротным парадкам слоў.
3. Выпісаць сказ, які адпавядае схеме: [ ], а [ ].

## Сасна

**Сасна** расце на сухім грудку ля чыгуначнага пераезда. Тут **развілка** і **скрыжаванне**. Пясчаны шлях, насыпаны ўзбоч чыгункі, вядзе ў лес і ў мястэчка, а прасёлкавая **дарога** — у мястэчка і ў поле. Вышэйшых дрэў паблізу, аж да самага лесу, няма, і сасну відаць здалёк. Купчастая, разгалістая, яна мала падобна да гонкіх сваіх сясцёр дзе-небудзь у бары.

Сонца сасне хапае. **Дажджы** абмываюць пыл, які садзіцца са шляху і чыгункі, паяць сухі грудок. Усе чатыры вятры гамоняць з сасной.

З нейкага часу **сасна** перастала расці. Можа, рост і ёсць, але непрыкметны, мізэрны, і людзі яго проста не заўважаюць. Ва ўсякім выпадку **Сцяпан Птах** — пуцявы абходчык, будка якога стаіць на другім баку



пераезда, амаль насупроць сасны, — усе апошнія гады карыстаецца адной і той жа астровінай, каб ускарабкацца на дрэва, дзе стаіць яго вулей. (129 слоў)

*Паводле І. Навуменкі*

**ЗАДАННІ**

1. Завучыць тэкст і запісаць па памяці.
2. Знайсці ў тэксце простыя сказы з прамым парадкам слоў і падкрэсліць у іх граматычныя асновы.
3. Вызначыць, якімі членамі сказа з'яўляюцца выдзеленыя словы.

## ДЫКТАНТ «ПРАВЯРАЮ СЯБЕ»

### Напрадвесні

Былі грамніцы. Гэта пачатак лютага, калі зіма сустракаецца з вясной. Па начах яшчэ трашчаць вострыя маразы і шалёныя завірухі намятаюць снегу па самыя стрэхі. Шэрыя зайцы, прыціснутыя халадамі, нахабна лезуць у сады, у стагі канюшыны, нават у пуні. Галубы і вераб'і забіваюцца пад стрэхі, зашываюцца ў гумны і свірны. Сініцы стукаюць дзюбамі ў вокны, а курапаткі падбягаюць да самых двароў.

Зіма лютуе, злуецца, не хоча ўступаць месца вясне і ўчэпіста трымаецца за зямлю, за дрэвы, за платы, за гладкія вочапы калодзежных жураўлёў. Але вясна наступае ўпэўнена і настойліва бярэ сваё. Як толькі сонца паднімаецца вышэй, на шыферных дахах, ад ветру, злёгку пачынае падтайваць снег. Спачатку пасочыцца па раўчуку маленькі вільготны струменьчык, потым другі, трэці. К поўдню з даху стане паднімацца пара, і заплача зіма, закапае на снег ля ганка буйнымі сярэбранымі кроплямі. (131 слова)

*Паводле В. Дайліды*

**ЗАДАННЕ**

Знайсці і падкрэсліць у тэксце сказы з адваротным парадкам слоў. Праверыць сябе.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ВЫБАРАЧНЫ ДЫКТАНТ

### Гісторыя кнігі

У старажытныя часы кніга была зусім не падобная да нашых.

На чым толькі не пісалі даўней людзі! На ўсім, што больш ці менш прыдавалася для пісьма! Некалькі гадоў таму назад у Беларусі пры раскопках старажытнага Віцебска знайшлі запісы, зробленыя на бяросце — бярозавай кары. Даўней шмат якія надпісы высякалі на камянях, выціскалі на гліняных плітках.

Уявіце сабе цаглінку таўшчынёю ў два пальцы. Сотні такіх цаглінак і ўтваралі старадаўнюю кнігу. А паспрабуй такую кнігу палажыць у ранец! Ды што кнігу! Часам, каб пераслаць такое пісьмо, трэба было збіраць у дарогу цэлы караван вярблюдаў. Адзін нумар часопіса «Вясёлка», «надрукаваны» на такіх таблічках, павёз бы хіба грузавік! Але ж грузавікоў у тыя часы не было...

Нязручная такая кніга? Толькі адна перавага была ў яе: ніякі пажар ёй не страшны. (125 слоў)

*Паводле А. Клышкі*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці ў тэксце і выпісаць клічныя і пытальныя сказы.
2. Вызначыць парадак слоў у выпісаных сказах.
3. Падкрэсліць у тэксце прамыя дапаўненні адной рысай, а ўскосныя — дзвюма.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ДЫКТАНТЫ

### Вёска дзяцінства

Вёска, дзе нарадзіўся і правёў дзяцінства Веньямін, невялікая, але надзвычай прыгожая. Яна як бы складаецца з трох пасёлкаў. Адзін пасёлак у полі, і жыты, ячмяні падступаюць ледзь не да самых хат. Пыльная вуліца, стромкія калодзежныя жураўлі, старыя



раскідзістыя вязы на плошчы ля школы. Веньямін жыў не тут. Сюды ён хадзіў у школу цэлых сем гадоў. Мог бы хадзіць разам з сёстрамі і маці, якая працавала настаўніцай, але хадзіў адзін або з сябрамі. Так яму больш падабалася, а маці не няволіла.

Два астатнія пасёлкі, падзеленыя чыгункай і невялічкай станцыяй, знаходзіліся ў лесе. Хаты стаялі пад самымі соснамі, а ўпрытык да чыгункі зелянелі агароды з залатымі, звернутымі да сонца шапкамі сланечнікаў. У правым пасёлку, у доміку, пабудаваным для настаўнікаў, жыў Веньямін. Ён аднолькава любіў гудкі імклівых цягнікоў, якія рэдка спыняліся на іхняй станцыі, і бясконца таямніча-ўрачысты пошум лесу. (136 слоў)

*Паводле І. Навуменкі*

### Дарога дадому

Іван любіў гэтую некароткую — што ні кажы, а ўсё ж дзесяць кіламетраў — дарогу дамоў. Яна мела над ім нейкую магічную ўладу, якой ён ахвотна падначальваўся, нават не адчуваючы гэтага. Трэба было толькі выйсці з вагона, мінуць пуці і заглыбіцца ў лес. Тады ўсё тое, чым ён жыў у горадзе, заставалася недзе там. А сам ён рабіўся як быццам іншым чалавекам, мякчэў, дабрэў. Маўклівы і задуменны па натуры, тут ён весялеў, ажыўляўся, яго цягнула гаварыць і смяяцца. Ён раптам пачынаў адчуваць у сабе смеласць і цвёрдасць чалавека, які лёгка і проста жыве на свеце. Чалавекам, для якога няма нічога немагчымага, які ўсё можа, варта толькі захацець. Ён і сам не ведаў прычыны такой перамены ў сабе, але перамена гэта была, і яна радавала яго. (123 словы)

*Паводле А. Кудраўца*

**ЗАДАННЕ**

1 в. — выпісаць з тэксту сказы з прамым парадкам слоў і зрабіць іх сінтаксічны разбор.
2 в. — выпісаць з тэксту сказы з адваротным парадкам слоў і зрабіць іх сінтаксічны разбор.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

## Змест


*Прадмова* ... 3

### СЛОВАЗЛУЧЭННЕ

ДЫКТАНТЫ ... 7
Папераджальны дыктант ... 7
Каменціраваны дыктант ... 8
Творчы дыктант ... 9
Вольны дыктант ... 9
Дыктант «Пісьмо па памяці» ... 10
Дыктант «Правяраю сябе» ... 11
Выбарачныя дыктанты ... 12
Кантрольны дыктант ... 12
ПЕРАКАЗЫ ... 13
ПЕРАКЛАДЫ ... 20
Пераклад-пераказ ... 29

### СКАЗ

ДЫКТАНТЫ ... 33
Папераджальныя дыктанты ... 33
Каменціраваныя дыктанты ... 34
Тлумачальны дыктант ... 36
Вольны дыктант ... 37
Дыктанты «Пісьмо па памяці» ... 37
Дыктант «Правяраю сябе» ... 39
Выбарачны дыктант ... 40
Кантрольныя дыктанты ... 40
ПЕРАКАЗЫ ... 42
ПЕРАКЛАДЫ ... 49
Пераклад-пераказ ... 50

### ПРОСТЫ СКАЗ: двухсастаўныя сказы

ДЫКТАНТЫ ... 53
Папераджальны дыктант ... 53
Каменціраваны дыктант ... 54
Тлумачальны дыктант ... 54
Творчыя дыктанты ... 55
Вольныя дыктанты ... 56
Выбарачныя дыктанты ... 60
Дыктант «Пісьмо па памяці» ... 61
Дыктант «Правяраю сябе» ... 62
Кантрольныя дыктанты ... 63
ПЕРАКАЗЫ ... 66
ПЕРАКЛАДЫ ... 74

### ПРОСТЫ СКАЗ: аднасастаўныя сказы

ДЫКТАНТЫ ... 91
Папераджальны дыктант ... 91
Каменціраваныя дыктанты ... 92
Тлумачальны дыктант ... 93
Творчы дыктант ... 94
Вольны дыктант ... 94
Выбарачны дыктант ... 95
Дыктант «Пісьмо па памяці» ... 96
Дыктант «Правяраю сябе» ... 97
Кантрольныя дыктанты ... 97
ПЕРАКАЗЫ ... 99
ПЕРАКЛАДЫ ... 107

### ПРОСТЫ СКАЗ: няпоўныя сказы

ДЫКТАНТЫ ... 109
Папераджальны дыктант ... 109
Каменціраваны дыктант ... 110
Дыктант «Пісьмо па памяці» ... 110
Дыктант «Правяраю сябе» ... 111
Кантрольныя дыктанты ... 112
ПЕРАКАЗЫ ... 113
ПЕРАКЛАДЫ ... 119

### ПРОСТЫ СКАЗ: сказы з аднароднымі членамі

ДЫКТАНТЫ ... 121
Папераджальныя дыктанты ... 121
Каменціраваныя дыктанты ... 123
Тлумачальны дыктант ... 124
Творчыя дыктанты ... 125
Вольны дыктант ... 126
Выбарачныя дыктанты ... 127
Дыктант «Пісьмо па памяці» ... 129
Дыктант «Правяраю сябе» ... 129
Кантрольныя дыктанты ... 130
ПЕРАКАЗЫ ... 132
ПЕРАКЛАДЫ ... 140


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ПРОСТЫ СКАЗ: сказы са звароткамі, пабочнымі словамі і выклічнікамі

ДЫКТАНТЫ ........................................................ 146
Тлумачальны дыктант ........................................................ 146
Вольныя дыктанты ........................................................ 147
Выбарачны дыктант ........................................................ 149
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........................................................ 149
Дыктант «Правяраю сябе» ........................................................ 150
Кантрольны дыктант ........................................................ 151
ПЕРАКАЗЫ ........................................................ 152
ПЕРАКЛАДЫ ........................................................ 157

## ПРОСТЫ СКАЗ: сказы з адасобленымі членамі

ДЫКТАНТЫ ........................................................ 162
Папераджальны дыктант ........................................................ 162
Каменціраваны дыктант ........................................................ 163
Тлумачальны дыктант ........................................................ 164
Вольныя дыктанты ........................................................ 164
Выбарачныя дыктанты ........................................................ 166
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........................................................ 167
Дыктант «Правяраю сябе» ........................................................ 168
Кантрольныя дыктанты ........................................................ 169
ПЕРАКАЗЫ ........................................................ 171
ПЕРАКЛАДЫ ........................................................ 179

## СПОСАБЫ ПЕРАДАЧЫ ЧУЖОЙ МОВЫ

ДЫКТАНТЫ ........................................................ 192
Папераджальныя дыктанты ........................................................ 192
Каменціраваны дыктант ........................................................ 193
Творчы дыктант ........................................................ 194
Вольны дыктант ........................................................ 195
Выбарачны дыктант ........................................................ 195
Кантрольны дыктант ........................................................ 196
ПЕРАКАЗЫ ........................................................ 197
ПЕРАКЛАДЫ ........................................................ 204
Пераклады-пераказы ........................................................ 206

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ